Источник: "Промышленная безопасность" - №9, 2024-09-23






# Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі

**Пад такой назвай у інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі прайшла міжнародная навуковая канферэнцыя, прысвечаная 525-годдзю атрымання горадам магдэбургскага права. Вынікі архіўных пошукаў, археалагічных раскопак, успаміны сведкаў тых часоў былі ў эпіцэнтры абмеркаванняў навукоўцаў і аматараў гісторыі і хутка лягуць на старонкі новай кнігі, якую створаць па матэрыялах гэтай канферэнцыі. Дарэчы, удзельнікам і спікерам канферэнцыі з'яўляецца ветэран МНС, які працягвае гістарычныя пошукі.**

Мінск — важнейшы сімвал Беларусі, які сёлета святкуе 957-годзе, з моманту заснавання меў важнае стратэгічнае значэнне і зараз адыгрывае адметную ролю ў міравой гісторыі. Лёс горада шмат каго цікавіць, таму розныя людзі з захапленнем гартаюць старонкі неадназначнай і загадкавай эпапеі горада, узнікшага не то на Нямізе, не то на Менцы... Пацікавімся і мы, а можа і самі што разам напішам у летапіс старажытнага паселішча. Ёсць такі шанец!



Анжэліка Кучынская. Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі

Па словах загадчыка сектара навукова інфармацыйнай работы Інстытута гісторыі НАН Беларусі Рагнеды Аляхновіч, канферэнцыя «Мінск і мінчане» арганізоўваецца ўжо ў сёмы раз Першая канферэнцыя была арганізована ў 2007 г сумесна з Мінгарвыканкамам, пасля чаго гістарычныя форумы сталі перыядычна праводзіцца.

Канферэнцыя прысвечана 525-годдзю атрымання Мінскам магдэбургскага права гэта было важнай падзеяй у жыцці паселішча права дало значны штуршок для развіцця, і да канца XVI стагоддзя Мінск стаў па значымасці чацьвёртым горадам на тэрыторыі Беларусі.

Канферэнцыя пра Мінск аб'ядноўвае даследчыкаў з розных галін і напрамкаў эканамістаў і гісторыкаў музееведаў і археолагаў архівістаў, а таксама людзей з розных краін, зацікаўленых падзеямі і выбітнымі асобамі з нашага мінулага Такія мерапрыемствы дапамагаюць вылучаць новыя напрамкі, усебакова вывучаць іх і па выніках сумеснай працы выдаваць новыя пазнавальныя кнігі з гісторыі горада. У фае інстытута была прадстаўлена тэматычная кніжная выстаўка, дзе можна было пагартаць рэдкія выданні са звесткамі пра старадаўняе жыццё і пабачыць новыя выданні выніки працы мінулых канферэнцый. А ў гэтым годзе нават запускаецца новы фармат канферэнцыі анлайн з доступам на ю-цюбе.

Прывітальнымі словамі пленарнае пасяджэнне адкрылі акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі, акадэмік, доктар гістарычных навук, прафесар Аляксандр Каваленя; начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы па справах моладзі Мінгарвыканкама Вольга Чамаданава, дырэктар Музея гісторыі горада Мінска Галіна Ладзісава. Госці заклікалі даражыць сваёй гісторыяй, захоўваць памяць аб продках, берагчы гістарычныя месцы, а таксама часцей наведваць музеі горада і пазнавальныя выставы, дзе прадстаўлена шмат цікавых экспанатаў




*Вынікі працы навукоўцаў*

Источник: "Промышленная безопасность" - №9, 2024-09-23



Шмат цікавай і нават сенсацыйнай інфармацыі было ў дакладах, прысвечаных такім тэмам, як вынікі археалагічных экспедыцый; канфесійнае жыццё мінчан і мінскія святыні, гісторыі мінскіх падкідышаў і справы судзебнай сістэмы; пажары і паводкі, дакументальныя матэрыялы і актыўныя ўдзельнікі Першай Усебеларускай краязнаўчай канферэнцыі, Мінская наступальная аперацыя Чырвонай Арміі (29 чэрвеня 4 ліпеня 1944 г ) і ўдзел у ёй беларускіх партызан; сярэдневечны Мінск і магдэбургскае права. Навукоўцы і даследчыкі працавалі ў трох тэматычных секцыях: «Сацыяльна-палітычнае жыццё», «Грамадскае жыццё. Культура» «Фарміраванне гарадской прасторы»



*Цікавыя экспанаты з гісторыяй*

Вельмі цікавымі і пазнавальнымі былі паведамленні Андрэя Вайцяховіча, кандыдата гістарычных навук, дацэнта, загадчыка аддзела археалогіі Сярэднявечча і Новага часу Інстытута гісторыі НАН Беларусі на тэму· «Новыя даследванні археалагічнага комплексу на р. Менка ў 2024 г папярэднія вынікі».

Апошнія археалагічныя раскопкі праводзіліся каля вёскі Гарадзішча Мінскага раёна, дзе, па меркаванні вучоных, было першапачатковае месца заснавання паселішча Мінск. Потым яго перанеслі на рэчку Нямігу, дзе амаль сем дзён адбывалася працівастаянне і гістарычная бойка паміж дружынамі полацкага князя Усяслава Брачыслававіча (Чарадзея) і трох братоў Яраслававічаў Мы ж памятаем класіку літаратурныя нататкі па слядах падзей 1067 г

На Немиге стелют снопы головами,
молотят цепами булатными,
жизни на току кладут
веют голову от тела.

Археолагі не ўпершыню працавалі на Менцы, менавіта там, дзе праглядаюцца сляды валоў, і вакол іх. Былі расчышчаны рэшткі ўнікальных артэфактаў· крыжыкі і пацеркі, чарапкі, але самы цікавы пояс дрэва-земляных абаронных клецяў складзеных з дубоў Устаноўлена, што яны датуюцца прыкладна 990-м годам, маюць адметную канструкцыю скрэпа, а таксама крукі-гакі. Тут нават знойдзены такі абярэжны элемент язычнікаў, як ужыўленыя сківіцы вепрука. Дарэчы, такія драўляныя канструкцыі падобны да раскопаных у старажытным польскім горадзе Гнёзна.

Горад Мінск праз стагоддзі развіваўся і сталеў, быў то каталіцкім, то праваслаўным, то ўніяцкім, а то і бязбожным, але далёка праславіўся цудадзейным вобразам Мінскай іконай Божай Маці, якая тут з 1500 г і якую з цягам часу апякавалі розныя канфесіянальныя братэрствы. Яна і зараз дае сучаснікам веру і надзею на лепшае.

Хутка ў горадзе на скрыжаванні еўра азіяцкіх дарог падчас дзеяння магдэбургскага права вырасла колькасць буйных высокапрафесійных масцерскіх цэхаў, а мелкія прыватныя майстры, якія не ўвайшлі ў тую прэстыжную сістэму набылі статус «партачоў», лічы, бракаробаў якія здольны выраблядь толькі нешта нізкагатункавае.

З ростам індустрыялізацыі павялічалася і колькасць прамысловых прадпрыемстваў горада на Нямізе. Канешне, чалавечы і іншыя фактары правакавалі буйныя пажары. Не абмінулі яны і Мінск. Развіццём і пераадоленнем такіх падзей аднойчы зацікавіўся ветэран МНС Андрэй Гоцін, які шмат гадоў вывучаў дакументальныя крыніцы, нават працаваў у архівах.



*А.А. Гоцін*



Анжэліка Кучынская. Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі

Источник: "Промышленная безопасность" - №9, 2024-09-23



У другой палове апошняй чвэрці XIX ст Мінск стаў буйнейшым прамысловым цэнтрам Заходняй Расіі, разважае Андрэй Аляксандравіч. У той час сталі з яўяцца мануфактуры і фабрыкі, шырока ўжывацца паравыя рухавікі, розныя машыны і іншыя тагачасныя інавацыі і нават з'явіўся адзін з узораў першых спроб Дзяржпрамнагляду Я з вялікім задавальненнем вывучаў гэту тэму ў архіве. Так атрымалася, што калі я шукаў дадатковыя дакументы пра развіццё мінскай пажарнай службы, знайшоў атэстат рашэнняў аб прымяненні ў гарадской пажарнай камандзе паравой пажарнай машыны. Была ў нас нават такая! Што датычыцца вялікіх пажараў то, на жаль, на вытворчасцях яны былі. Адбыўся буйны пажар у 1904 г. на Паравозабудаўнічым заводзе (завод існуе дагэтуль і вядомы як Вагонарэмонтны завод) Буйнейшы ў Паўночна-Заходніх губернях (іншыя былі толькі на Урале і ў Санкт-Пецярбурзе), пасля стыхіі ён страціў свой статус і ператварыўся ў Вагонарэмонтны завод. Не абміналі нас пажары жылой забудовы, бо Мінск у большасці складалі дзясяткі кіламетраў драўляных будынкаў. Вядомы пажар у Мінскай губернскай гімназіі і іншыя вогненныя здарэнні. Таму хачу прапанаваць чытачам убачыць больш цікавых экспанатаў у Музеі пажарных і аварыйна-выратавальных спраў, дзе захаваўся старажытны будынак пажарнага дэпо, пабудаваны намаганнямі членаў Мінскага вольнага таварыства пажарных і паляўнічых, а таксама ў Музеі агню і іншых экспазіцыях.

Напрыканцы і я параю чытачам больш цікавіцца сваімі паселішчамі, шукаць і знаходзіць новае ў мінулым, наведваць музеі і любіць Беларусь нашу мілую, слаўную і мірную!

*Анжэліка КУЧЫНСКАЯ, «ПБ»*
*Фота аўтара*






Анжэліка Кучынская. Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі